ДАВЕДКА
да заданняў гарадскіх, раённых алімпіяд
па вучэбных прадметах "Беларуская мова" і "Беларуская літаратура"

Заданні	1	2	3	4	5	6	7	8	9	10	Усяго
Балы	5	5	5	5	5	5	5	5	5	5	50

VIII клас

Заданне 1. Адкажыце на пытанні.

Максімальная колькасць балаў – 5 (1 бал – за кожны правільны адказ).

1. Закончыце фармулёўку: Дыялектныя словы – гэта словы, якія *ўжываюцца на абмежаванай тэрыторыі і выкарыстоўваюцца ў мясцовых гаворках*
2. Устанавіце назву месяца, пра які ідзе гаворка ў прыказцы … і косіць, і жне – доўга спаць не дае. *Ліпень*
3. Запішыце словазлучэнне дзве таполі ў форме творнага склону *дзвюма таполямі*
4. Мы гаворым: "Хлопчык чытаў бы, дзяўчынка чытала б". А як правільна ўжыць дзеясловў чытаць у форме ўмоўнага ладу, гаворачы пра дзіця? *чытала б*
5. Усім беларусам добра вядома прыказка *Няма смачней вадзіцы, як з роднай крыніцы.* Якая граматычная памылка ў ёй дапушчана? Запішыце правільны варыянт прыказкі. *смачнейшай вадзіцы*

Заданне 2. Вядома, што назоўнікі 2-га скланення ў родным склоне маюць канчаткі -у (-ю) або -а (-я). Некаторыя з гэтай групы назоўнікаў могуць ужывацца з канчаткам -у (-ю) і з канчаткам -а (-я). Запішыце лексічныя значэнні прапанаваных слоў, растлумачыўшы гэтым правапіс адпаведнага канчатка.

Максімальная колькасць балаў – 5 (0,5 бала – за кожны правільны адказ).

Назоўнік	Лексічнае значэнне для канчатка – а (-я)	Лексічнае значэнне для канчатка –у (-ю)
Узор: пейзаж(а/у)	*жанр жывапісу*	*мясцовасць, краявід, прасторавае значэнне*
народ(а/у)	*нацыя, этнас*	*група людзей, натоўп*
бялк(а/у)	*частка яйка*	*рэчыва*
дуб(а/у)	*дрэва*	*драўніна, рэчыва*
курс(а/у)	*пэўная ступень навучання, сістэма заняткаў, заняткі для групы людзей, цана грашовай адзінкі іншай дзяржавы і інш.*	*напрамак, прасторавае значэнне*
пераход(а/у)	*месца на праезнай частцы, тунэль*	*працэс, дзеянне*

Заданне 3. Аднавіце ўстойлівыя спалучэнні па іх агульным значэнні, пачынаючы са слова *глытаць*.

Максімальная колькасць балаў – 5 (1 бал – за кожны правільны адказ).

"несправядліва абвінавачваць, незаслужана зневажаць каго-небудзь"	ліць	*бруд (памыі)*
"гаварыць пустое, пустасловіць"		*ваду*
"двудушна, прытворна або няшчыра скардзіцца"		*кракадзілавы слёзы*
"гінуць, паміраць ці пакутаваць, абараняючы каго-небудзь ці што-небудзь"		*кроў*
"растлумачваючы, рабіць зразумелым што-небудзь"		*святло*

Заданне 4. Замяніце выразы аднаслоўнымі беларускімі адпаведнікамі.

Максімальная колькасць балаў – 5 (0,5 бала – за кожнае спалучэнне)

В этом году	*Сёлета*
В прошлом году	*Летась*
В позапрошлом году	*Залетась (пазалетась)*
Летучая мышь	*Кажан*
Хлопчатобумажная ткань	*Бавоўна*
Испокон веку	*Спрадвеку*
В следующем году	*Налета*
В середине дня	*Апоўдні*
Падающая звезда	*Знічка*
Каждый день	*Штодзень*

Заданне 5. Прачытайце словазлучэнні. Правільна ці памылкова запісаны колькасна-іменныя словазлучэнні? Пастаўце адпаведныя знакі ў пустыя клеткі табліцы. Пры адказе "так" пастаўце знак "+", пры адказе "не" – пастаўце "–".

Максімальная колькасць балаў – 5 (0,5 бала – за кожны правільны адказ).

больш трох гадоў	–	паўтара рубля	+
трое камбайнаў	–	абодвум вучаніцам	–
пяцёра нас	+	пяць восьмых цэнтнера	+
два прыгожых сталы	–	тры трэціх пірага	–
паўтара тоны	–	дзве жанчыны	+

Заданне 6. Запоўніце табліцу, указаўшы словы, ад якіх ўтвораны прапанаваныя, і спосаб іх утварэння.

Максімальная колькасць балаў – 5 (0,5 бала – за кожную правільна запоўненую клетку).

Утваральнае слова	Вытворнае (утворанае) слова	Спосаб утварэння
Узор: здзейсніць	здзяйсненне	суфіксальны
вучань	вучнёўскі	*суфіксальны*
лісты	лісце	*нулявая суфіксацыя*
блытаць	наблытаць	*прыставачны*
наладзіць	наладчыдчык	*суфіксальны*
зямля+е+капаць	землекапальны	*асноваскладанне з суфіксацыяй*

Заданне 7. Уявіце сябе перакладчыкамі. Перакладзіце ўрывак з тэксту на беларускую мову.

Максімальная колькасць балаў – 5

За кожную памылку (любога тыпу)ад максімальнай колькасці балаў адымаецца 0,1 бала, але павінна атрымацца не менш за 0 (нуль) балаў.

Прыкладны пераклад: Выйшаў аднойчы (неяк) вожык з дому грыбоў назбіраць, важанят накарміць. Зіма наперадзе доўгая, без прыпасаў (харчоў) не абысціся. Шмат (многа, багата) грыбоў назбіраў! Усім важанятам хопіць, і сяброў пачаставаць можна! Мікіта і Дзяніс таксама выраўшылі (рашылі) схадзіць у лес па грыбы. Ды толькі вось грыбы ўсе некуды (кудысьці) пахаваліся, пад лісточкамі (лісцікамі) ды галінкамі ўкрыліся. Раптам бачаць хлопцы пад дрэвам узгорачак (пагорачак) маленькі, а на ім грыбоў безліч (не злічыць)! І баравікі, і падбярозавікі (абабкі), і масляты!

Заданне 8. Устанавіце адпаведнасць паміж слоўнікавымі артыкуламі ў левым слупку і слоўнікамі, з якіх яны ўзяты, у правым. Адказ запішыце ў выглядзе спалучэнняў літар і лічбаў (напрыклад: А1, Б2, В3, Г4, Д5).

Максімальная колькасць балаў – 5 (1 бал – за кожны правільны адказ)

Слоўнікавы артыкул	Слоўнік
А. сто́мленасць, -і, Т -цю	1. Слоўнік паронімаў
Б. разы́нкі, -нак, *адз.* разы́нка, -і ДМ -нцы, *ж.* Сушаныя ягады винаграду. *Пірог з разынкамі. // прым.* разы́нкавы, -ая, -ае.	2. Слоўнік эпітэтаў
В. каранасты, каранёвы, караністы, карэнны	3. Арфаграфічны слоўнік
Г. (Луг) бяскрайні, прасторны, шырокі, аксамітны, густы, мурожны	4. Адваротны слоўнік
Д. Лютаўскі, крамлёўскі, філасофскі, казахскі	5. Тлумачальны слоўнік

Адказ <u>А3, Б5, В1, Г2, Д4</u>

Заданне 9. Успомніце вывучаныя раней творы, знайдзіце (падкрэсліце) "чацвёртае лішняе" ў адпаведнасці з вызначанай умовай і абгрунтуйце свой выбар.

Максімальная колькасць балаў – 5
(0,5 бала – за выбранае чацвёртае лішняе і 0,5 бала – за абгрунтаванне).

Творы	Умова адбору	Абгрунтаванне
М. Лупсякоў "Мэры Кэт", І.Навуменка "Настаўнік чарчэння", <u>*К. Чорны "Насцечка"*</u>, М.Лынькоў "Васількі"	у адпаведнасці з жанрамі твораў	*Аповесць, астатнія творы па жанравай прыналежнасці з'яўляюцца апавяданнем*
<u>*В. Карамазаў "Дзяльба кабанчыка"*</u>, В. Адамчык "Салодкія яблыкі", В. Быкаў "Незагойная рана", М.Лынькоў "Васількі"	у адпаведнасці з мастацкім зместам	*Узнята праблема ўзаемаадносін бацькоў і дзяцей, у астатніх паказваецца вайна ў розных аспектах*
М. Багдановіч "Зімой", П.Трус "Падаюць сняжынкі…", М. Багдановіч "Маёвая песня", <u>*І. Пташнікаў "Алені"*</u>	у адпаведнасці з родамі літаратуры	*Апавяданне адносіцца да эпасу, астатнія творы – да лірыкі*
"Бацькаўшчына", "Зямля пад белымі крыламі", <u>"Калі ласка"</u> "Лебядзіны скіт"	аўтар	*Аўтарам верша з'яўляецца П.Броўка, астатніх твораў – У.Караткевіч*
"Дамавікова ўдзячнасць", <u>*"Вужыная карона"*</u>, прыказкі і прымаўкі, "Лёгкі хлеб"	фальклор і літаратура	*Аўтарам апавядання з'яўляецца Я.Баршчэўскі (літаратурны твор), астатніх – народ (фальклорныя)*

Заданне 10. Устанавіце адпаведнасць паміж стопамі, вызначыўшы іх па першым радку ўрыўка, і радкамі з лірычнага твора. Адказ запішыце ў выглядзе спалучэнняў літар і лічбаў (напрыклад: А1, Б2, В3, Г4, Д5).

Максімальная колькасць балаў – 5 (1 бал – за кожны правільны адказ).

Вершаваны памер	Урывак з лірычнага твора
А. дактыль	1. Здароў, марозны, звонкі вечар! Здароў, скрыпучы, мяккі снег! Мяцель не вее, сціхнуў вецер, І волен лёгкіх санак бег. М.Багдановіч
Б. ямб	2. Бедны хлопчык быў загнаны, У бацькоў нялюбы сын,

	Бо відочныя заганы І меў толькі ён адзін. Я.Колас
В. амфібрахій	3. Колькі па свеце схадзілі, Ператапталі бяды, Толькі дыханне Радзімы Кліча здалёку заўжды. Я.Янішчыц
Г. харэй	4. Дуб галлё распусціў каранасты над ім, Сухазелле у грудзі ўпілося; Вецер стогне над ім уздыханнем глухім — Аб мінуўшчыне ў жальбах галосе. Я.Купала
Д. анапест	5. Я чула пяшчотнае, шчырасці поўнае, маё, беларускае, роднае, кроўнае, такое раптоўнае, такое чароўнае. Д.Бічэль

__АДКАЗ__ А3 Б1 В5 Г2Д4